# АЛЯКСАНДР СЕМЯНТОЎСКІ: ЭТНОГРАФ, ФАЛЬКЛАРЫСТ, АРХЕОЛАГ

## Жыццёвы шлях і навуковая дзейнасць даследчыка духоўнай спадчыны беларусаў



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар

**Культуралагічная думка Беларусі ў XIX ст. складвалася пад уплывам разнастайных эканамічных, сацыяльна-палітычных, культурных і ідэйных фактараў. Яе ажыўленню спрыяла распаўсюджванне ідэй шматлікіх канцэпцый культуры: еўрапацэнтрызму, заходнерусізму, міфалагізму, панславізму і інш. Садзейнічаў фарміраванню свядомасці інтэлігенцыі і нацыянальна-вызваленчы рух, які разгарнуўся ў 20–40-я і 60-я гады. У літаратуру, выяўленчае мастацтва, навуку прыйшла бліскучая плеяда творцаў, якія, стоячы на пазіцыях дваранскага асветніцтва, арыентаваліся на духоўныя каштоўнасці народа і сталі выразнікамі яго нацыянальных і сацыяльных памкненняў. Асобныя прадстаўнікі навуковай эліты ажыццяўлялі грунтоўнае даследаванне духоўнага жыцця беларусаў. Сярод іх ярка вылучаецца асоба Аляксандра Максімавіча Семянтоўскага-Курылы (1821–1893).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Служачы лясного корпуса

У канцы XIX ст. пачынаецца кансалідацыя беларускай нацыі. На грамадскую арэну выходзіць шэраг вядомых беларускіх пісьменнікаў, фалькларыстаў, этнографаў. П. Бабpоўскі, А. Багдановіч, Н. Васільева, У. Вярыга, Л. Галамбёўскі, І. Грыгаровіч, З. Даленга-Хадакоўскі, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, А. Кіркор, Ю. Крачкоўскі, І. Насовіч, М. Нікафароўскі, Е. Раманаў, А. Сапуноў публікуюць шэраг грунтоўных прац, у якіх прадстаўлены разнастайныя артэфакты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў. «Ніколі этнаграфія, – адзначаў А. Семянтоўскі, – як навука не звяртала на сябе столькі ўвагі вучоных і наогул адукаваных людзей, як у другой палове бягучага стагоддзя, калі да спраў дзяржаўнай палітыкі далучылася шматзначнае нацыянальнае пытанне» [3, с. 1].



У гэты ж перыяд актывізуецца дзейнасць расійскіх і польскіх даследчыкаў па вывучэнні гісторыі, мовы, фальклору беларускага народа. Прадстаўнікі расійскай афіцыйнай навукі імкнуліся адшукаць агульнасць рускай і беларускай культур і даказаць, што барацьба беларусаў за дзяржаўную незалежнасць беспадстаўная. Польскія прадзяржаўныя навукоўцы намагаліся даказаць агульнасць гісторыі беларусаў і палякаў, адкуль вынікала неабходнасць уваходжання адпаведных тэрыторый у склад Рэчы Паспалітай.

Аляксандр Максімавіч Семянтоўскі-Курыла быў накіраваны расійскім урадам у Віцебскую губерню з мэтай спрыяння асіміляцыі мясцовага насельніцтва. Яго прызначылі сакратаром губернскага статыстычнага камітэта і адначасова рэдактарам неафіцыйнай часткі «Витебских губернских ведомостей» (пазней А. М. Семянтоўскі стаў рэдактарам «Памятной книжки Витебской губернии»).



Асэнсаванае, аб'ектыўнае спасціжэнне культуры беларусаў, 30-гадовае пастаяннае пражыванне Семянтоўскага ў беларускім асяроддзі дазваляе, на наш погляд, гаварыць пра феномен культуралагічнай інтэрферэнцыі. У фізіцы інэрферэнцыяй называецца ўзаемнае ўзмацненне ці паслабленне хваль пры налажэнні; у псіхалогіі – узаемадзеянне, пры якім навыкі, раней набытыя кожным з партнёраў, робяць уплыў на ўтварэнне ў кожнага з іх новых навыкаў. У культуралогіі пад інтэрферэнцыяй разумеецца накладанне, судакрананне розных культурных плыняў як у сферы высокай культуры, так і ў паўсядзённым жыцці. У працэсе кантактавання прадстаўнікі розных культур засвойваюць культуру і мову іншай супольнасці, але ў той жа час не страчваюць гістарычную памяць і нацыянальную самасвядомасць. Засваенне норм, каштоўнасцей і традыцый іншай культуры, безумоўна, узбагачае асобу і спрыяе яе плённай самарэалізацыі ў творчасці, навуковай і мастацкай дзейнасці. Культурная інтэрферэнцыя ўяўляе сабою працэс паўторнай сацыялізацыі дарослага чалавека (рэсацыялізацыю). Вынікам навукова-даследчай дзейнасці Семянтоўскага з'явілася не толькі павышэнне яго ўласнага культурнага ўзроўню, але і ўзбагачэнне беларускай культуры.

Нарадзіўся будучы этнограф у 1821 г. на Палтаўшчыне ў сям'і стацкага саветніка, урача. З 1834 г. па 1840 г. юнак вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Ліцэя князя А. Г. Кушалева-Безбародкі ў горадзе Нежын Чарнігаўскай губерні. Навучанне праходзіла па некалькіх кафедрах: чыстай матэматыкі, прыкладной матэматыкі, фізікі, хіміі і тэхналогіі, натуральнай гісторыі, рускай славеснасці, рускай гісторыі, статыстыкі, французскай і нямецкай літаратуры. Нежынскі ліцэй вышэйшых навук даваў сваім выхаванцам шырокую гуманітарную адукацыю.

З 1843 г. па 1860 г. Семянтоўскі служыў у лясным корпусе ў Кіеўскай і Падольскай губернях. За 17 гадоў бездакорнай службы ён прайшоў шлях ад прапаршчыка да стацкага саветніка. Сваю службу спалучаў з навуковай дзейнасцю. Так, у Звенігародскім павеце, непадалёк ад Кіева, Семянтоўскім былі адкрыты радовішчы лігніт-бурага вугалю і арганізавана яго здабыча. Пры Кіеўскай палаце дзяржаўных гаспадарак Аляксандр Максімавіч стварыў кабінет прыродазнаўчых навук. На першай Кіеўскай сельскагаспадарчай выставе, куратарам якой ён з'яўляўся, выстаўляў калекцыю мясцовых мінералаў.

Адначасова Семянтоўскі вывучаў украінскі фальклор. Яго пасада была звязана з пастаяннымі паездкамі па Кіеўскай і Падольскай губернях. Падчас службовых вандровак ляснічы метадычна запісваў малыя формы вуснай народнай творчасці. У выніку ў 1851 г. быў апублікаваны зборнік «Маларускія і галіцкія загадкі».

### Даследчык традыцыйнай культуры

У поўнай меры талент даследчыка і транслятара паўсядзённай культуры народа А. М. Семянтоўскага раскрыўся падчас шматгадовай службы ў Беларусі, куды, як мы ўжо паведамлялі, ён быў прызначаны сакратаром губернскага статыстычнага камітэта. У адрозненне ад шэрагу іншых расійскіх чыноўнікаў Аляксандр Максімавіч прыхільна ставіўся да беларускага народа, спачуваў яго цяжкаму матэрыяльнаму становішчу. Працу сакратара губернскага статыстычнага камітэта спалучаў з актыўнай археалагічнай, этнаграфічнай і фалькларыстычнай навуковай дзейнасцю. Семянтоўскі з цікавасцю даследаваў побыт і культуру беларусаў. Вынікам гэтых даследаванняў сталі яго арыгінальныя працы «Сінельна-набойная вытворчасць у г. Віцебску» (1864) і «Пра кірмашы Віцебскай губерні» (1867). Але найбольш грунтоўным яго творам з'яўляецца, на наш погляд, «Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні» (1872). У ім адлюстравана карпатлівая праца даследчыка па выяўленні этнічных адметнасцей беларускай мовы, нацыянальных асаблівасцей беларусаў, самабытнасці іх культуры. Каштоўнасць гэтай выдатнай працы ў тым, што звесткі аб побыце беларусаў этнограф браў «не з друкаваных кніжак, не з чужых павярхоўных поглядаў», як зазначае сам А. М. Семянтоўскі, а з народных першакрыніц, збіраючы іх асабіста [3].

На падставе этнаграфічнага матэрыялу даследчык робіць выснову, што ядро насельніцтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Віцебскай губерні складаюць беларусы (61 %). Між тым афіцыйныя расійскія навукоўцы імкнуліся даказаць, што на тэрыторыі Віцебшчыны пражывалі пераважна рускія, а афіцыйныя польскія – што палякі. Аб'ектыўныя статыстычныя звесткі, прадстаўленыя Семянтоўскім, ушчэнт разбівалі і расійскую, і польскую канцэпцыі. Складзеная ім этнаграфічная карта паказвае, што ў Віцебскай губерні рускіх пражывала каля 5%, а палякаў – 2,5%.

Ён рэзка крытыкаваў працу Ф. Р. Эркерта «Погляд на гісторыю і этнаграфію заходніх губерняў Расіі». Гэты аўтар сцвярджаў, што рысы, якія адрозніваюць адны народы ад іншых, вызначаюцца веравызнаннем. На гэтай падставе акаталічаных беларусаў, латышоў, эстонцаў і прадстаўнікоў іншых этнасаў, якія пражывалі на Віцебшчыне, Эркерт залічваў у палякі, а ўсіх праваслаўных – у рускія. Памылковасць гэтага погляду, на думку А. М. Семянтоўскага, вынікала з таго, што аўтар узгаданай працы абапіраўся не на асабістыя назіранні, а на паведамленні расійскіх ваенных, пэўны час раскватараваных у населеных пунктах Беларусі. Безумоўна, погляды расійскіх ваенных былі павярхоўныя і неаб'ектыўныя. Семянтоўскі падышоў да вызначэння этнічнага складу насельніцтва, якое пражывала на тагачасных беларускіх землях, навукова. Палемізуючы з Эркертам, ён раіў: «Больш радыкальна было б прыняць за этнаграфічную прыкмету размежавання народнасцей родную мову народа, г. зн. тую, на якой ён размаўляе з дзяцінства, тую, што пастаянна ўжываецца ў яго сям'і і дасталася яму, так бы мовіць, у спадчыну». Краязнаўца сцвярджаў, што не толькі няма адрозненняў у паўсядзённай культуры беларусаў-католікаў і беларусаў-праваслаўных, але і бытавая культура шляхты недалёка адышла ад культуры сялян-беларусаў [3, с. 2]. Зыходзячы з моўнага крытэрыю, этнограф насуперак афіцыйным меркаванням сцвярджаў, што «ў Віцебскай губерні пражываюць значнымі групамі з народаў славянскага племені: беларусы, велікарусы і палякі... Ядро насельніцтва Віцебшчыны складаюць беларусы» (61 %) [3,с. 3].

Кожнай народнасці А. М. Семянтоўскі прысвячае асобны раздзел кнігі. Апісанне этнасаў, якія пражывалі ў Віцебскай губерні, ён пачынае з беларусаў, а не з рускіх, як гэта было прынята прадстаўнікамі афіцыйнай навукі. Пры гэтым у тэксце, прысвечаным беларусам, адчуваецца глыбокая сімпатыя да іх. Этнограф піша: «Беларусы набожныя, гасцінныя, вясёлыя, даверлівыя, цярплівыя і незлапамятныя і ў той жа час прымхлівыя, беражлівыя да скупасці, самалюбівыя, падатлівыя на ліслівасць, асцярожныя, стрыманыя і скрытныя» [3, с. 11]. Сярод духоўных каштоўнасцей беларусаў даследчык адзначае працавітасць: «Нельга сказаць, каб беларус быў пазбаўлены дароў духоўных, каб зямля, якую ён неяк апрацоўвае дапатопнай сахой ды смыкам з суччя, не магла дзесяцярыцай адплаціць яму за сапраўды цяжкую працу, каб тапаграфічныя ўмовы вобласці беларусаў і фізічная прырода іх саміх стварала неадольныя перашкоды» [3, с. 14].

У разглядаемай працы А. М. Семянтоўскі вельмі кампетэнтна характарызуе паўсядзённую культуру беларусаў Віцебскай губерніі, асабліва жыллё і яго інтэр'ер, гаспадарчыя будынкі, ежу, вопратку, прылады працы. Вось, напрыклад, як ён апісвае быт беларуса: «Як і стол, непатрабавальнае таксама і жыллё беларуса. Малако, тварог, увосень і зімой бульба, капуста, буракі, боб, гарох, а летам шчаўе, бацвінне і г.д. пры чорным хлебе, дрэнна выпечаным з непрасеянай жытнёвай мукі, змолатай з дрэнна адвеянага зерня на хатніх ручных жорнах, – вось звычайная, і то ў добры год і прытым у заможнага селяніна, ежа большасці беларусаў. «Хата беларуса цесная, душная, курная, з бярвення, крытая часам гонтай без цвікоў, часам саломай, хата з адным ці двума маленькімі аконцамі, сяк-так застаўленымі кавалачкамі шкла...» [3, с. 13]. Прычыну беднасці тагачасных беларусаў Семянтоўскі бачыць у сацыяльнай і эканамічнай палітыцы цэнтральных і мясцовых улад. Аўтар, у прыватнасці, прапануе мясцовым уладам хутчэй увесці адзіную сістэму мер і вагі. Таму што, на яго погляд, «вялікі разнабой меры і вагі стрымлівае развіццё гандлю, прыводзіць да падману сялян рознымі перакупшчыкамі» [4].

Этнограф дэталёва аналізуе такі элемент культуры, як народны касцюм. І прыходзіць да высновы, што касцюм беларусаў не складаны і «адрозніваецца першабытнай прастатой, толькі галаўныя ўборы жанчын некалькі больш разнастайныя. Любімы колер беларусаў белы: белы кажух, белая рубашка і нагавіцы, белы палатняны пояс, белая спадніца ў жанчын, белы фартух, хусціна» [3, с. 12].

Увогуле пазітыўна характарызуючы беларусаў, А. М. Семянтоўскі дапускае пэўныя супярэчлівыя ацэнкі іх ментальных якасцей. Паводле яго слоў, беларусы па сваіх інтэлектуальных і фізічных здольнасцях саступаюць рускім. Суб'ектыўным, на наш погляд, з'яўляецца і яго меркаванне аб вялікай прыхільнасці тагачасных беларусаў да гарэлкі.

Унікальны матэрыял для сучасных даследчыкаў традыцыйнай культуры беларусаў утрымліваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў працы «Беларускія старажытнасці» (1890) [6]. Гэта выдатна ілюстраванае выданне з 106 выявамі розных артэфактаў. А. М. Семянтоўскі паведамляе звесткі аб помніках даўніны, большасць з якіх да нашага часу не захавалася і назаўсёды страчана. Асобныя раздзелы кнігі прысвечаны: а) земляным помнікам; б) замкам і замчышчам; в) знаходкам з курганоў; г) помнікам каменнага веку; д) камяням са старажытнымі надпісамі; е) старажытным храмам Віцебскай губерні; 7) старажытным царкоўным прадметам. Побач з апісаннем земляных валоў, насыпаў, курганоў, замкаў і археалагічных знаходак А. М. Семянтоўскі прыводзіць вялікую колькасць аўтэнтычных народных паданняў, дае падрабязнае апісанне абрадаў.

Праца А. М. Семянтоўскага «Аб мерах і вазе, якія выкарыстоўваюцца цяпер і ўжываліся ў старыя гады ў Віцебскай губерні» (1878) [4] паспрыяла, на наш погляд, развіццю айчыннай метралогіі. Аўтар сцвярджаў, што вывучэнне адзінак народнай метралогіі неабходна для ўсебаковай характарыстыкі паўсядзённай культуры беларусаў. У працы даецца апісанне 53 адзінак мер і вагі, якія бытавалі ў XIX ст. на тэрыторыі Віцебскай губерні. Этнограф асобна характарызуе меры для сыпучых цел, меры для вадкасцей, лінейныя меры, меры шляху, пазямельныя меры, кубічныя меры.

## Этнограф-асветнік: навуковая спадчына

У 1882 г. Аляксандр Максімавіч выходзіць у адстаўку і застаецца ў Беларусі. Ён набывае маёнтак Ражаншчына ў Лепельскім павеце і пасяляецца там са сваёй вялікай сям'ёй.

У Аляксандра Максімавіча і яго жонкі Еўфрасіні Паўлаўны нарадзілася пяць дзяцей: тры дачкі і два сыны. Бацькі вельмі клапаціліся аб іх адукацыі і выхаванні. Усе дзеці закончылі Віцебскую гімназію, некаторыя атрымалі і грунтоўную вышэйшую адукацыю. Так, Зінаіда Аляксандраўна закончыла Пецярбургскі Кацярынінскі інстытут, была фрэйлінай імператрыцы, перапісвалася з Гі дэ Мапасанам, была знаёма з Густавам Флабэрам. Барыс Аляксандравіч атрымаў вышэйшую адукацыю ў Пятроўскай земляробчай акадэміі, займаў розныя пасады ў Сенненскім павеце Магілёўскай губерні, у вольны час займаўся археалогіяй. Сяргей Аляксандравіч з'яўляўся старшынёй Лепельскай земскай управы, таксама актыўна займаўся археалогіяй.

Сышоўшы з дзяржаўнай службы, Семянтоўскі працягвае актыўную навукова-даследчыцкую дзейнасць. Ён значна папаўняе сабраныя раней звесткі аб помніках Віцебскай даўніны, дарабляе напісанае раней. Так, у гэты перыяд этнограф збірае і сістэматызуе звесткі аб крэпасці Азярышча, апісвае помнікі Гарадоцкага павету. У кола навуковых інтарэсаў даследчыка таксама ўваходзяць гісторыя Віцебскай губерні, археалогія, статыстыка, народная адукацыя, фабрычна-заводская прамысловасць, клімат, карысныя выкапні, этнаграфія і г. д. Увогуле А. М. Семянтоўскі аўтар 159 прац і публікацый, 33 з іх прысвечаны ўкраінскай, 126 – беларускай тэматыцы.

Ёсць усе падставы сцвярджаць, што шматлікія грунтоўныя працы А. М. Семянтоўскага па сацыядынаміцы беларускай традыцыйнай культуры з'явіліся ў выніку інтэрферэнцыі, засваення і прыняцця ім дамінантных культурных каштоўнасцей, ідэалаў, архетыпаў, абрадаў і звычаяў беларусаў. Бясспрэчна, азнаямленне сучаснай грамадскасці з даследаваннямі выдатнага этнографа будзе безумоўна карысным для захавання нашай культурнай памяці.

Памёр А. М. Семянтоўскі ў 1893 г. На Ражанскіх могілках, дзе быў пахаваны этнографасветнік, у 2002 г. яму ўстаноўлены помнік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА


1. **Бандарчык, В. К.** Семянтоўскі Аляксандр Максімавіч / В. К. Бандарчык // Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. – Мінск: Навука і тэхніка, 1964. – С. 122–126.
2. **Сементовский, А. М.** Синельно-набойное производство в г. Витебске / А. М. Сементовский // Витебские губернские ведомасти. – 1864. – № 43.
3. **Сементовский, А. М.** Этнографический обзор Витебской губернии / А. М. Сементовский. – СПб.: Тип. М. Хана, 1872. – 69 с.
4. **Сементовский, А. М.** О мерах и весе, употребляемых ныне и употреблявшихся в старые годы в Витебской губернии / А. М. Сементовский // Памятная книжка Витебской губернии на 1878. – СПб.: Тип. Вульфа, 1878. – 20 с.
5. **Сементовский, А. М.** Памятники старины Витебской губернии / А. М. Сементовский. – СПб.: Тип. Вульфа, 1867. – 74 с.
6. **Сементовский, А. М.** Белорусские древности / А. М. Сементовский. – СПб.: Тип. Вульфа, 1890. – 104 с.